Слова для Жыцця (95)

Аўтар: Рэдакцыя
26.07.2015 01:00

Папа Францішак

“Пан сам спашле дождж, і наша зямля прынясе плён”, – так сцвярджае псалом (85 [84], 13). Мы запрошаны на святкаванне гэтай таямнічай камуніі паміж Богам і Яго Людам, паміж Богам і намі. Дождж з’яўляецца знакам Яго прысутнасці на зямлі, якую мы апрацоўваем сваімі рукамі. Гэта камунія, якая заўсёды прыносіць плён, якая заўсёды дае жыццё. Такі давер вынікае з веры, з ведаў, якія разлічаны на Яго ласку, якія заўсёды пераменяць і напояць нашу зямлю.

Гэта давер, якому мы вучымся, для якога выхоўваемся. Давер, які пачынаецца ва ўлонні супольнасці, у жыцці сям’і. Давер, які становіцца сведчаннем на тварах мноства лю-дзей, што пабуджаюць нас пайсці за Езусам, стаць вучнямі Таго, хто не расчароўвае.

Фрагмент гамілії, прамоўленай падчас св. Імшы ў парку Ну Ігуасу †

Кс. абп Клаўдыа Гуджэроці

Маці Божая, якая трымае ў руках маленькага Збаўцу, трымае таксама кожнага са сваіх

дзяцей, бо і мы маем удзел у Целе і Крыві Яе Сына. Паспрабуйце адчуць, што кожнага з вас нясе на руках Маці Божая і паслухайце, што Яна кажа вам. Яна кажа: “Беларускі народ, ты супольнасць вернікаў. Будзь адважным і май веру ў будучыню. Было шмат цяжкасцей у тваёй гісторыі, але працуй дзеля будучыні, намагайся, каб будучыня была лепшай”. Кожнаму з нас Яна кажа: “Паспрабуй выйсці з абшару твайго страху, паспрабуй нарадзіцца, каб жыць без яго”.

Фрагмент гаміліі, прамоўленай падчас урачыстасцей у Будславе